ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (1131) ● Чацвер, 20 мая 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● ЗВАРОТ ДА БАЙЦОЎ СБА ● ІДУЦЬ ДЗЯРЖЭКЗАМЕНЫ ● ГРАМАДСКІ ДЭКАНАТ ДЗЕЙНІЧАЕ ● ВЫНІКІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ ● АКТЫЎНАСЦЬ НАРАДЖАЕ ПЛЕН ● ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА... ● ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ ● КАЛІ ТЫ ЛЮБІШ КНІГУ...

## АПОШНЯЯ АДЗНАКА Ў ЗАЛІКОЎЦЫ

Нейк зусім непрыкметна праляцелі пяць гадоў вучобы ў родным універсітэце. Яшчэ нядаўна можна было пачуць: «Хутчэй бы скончыць універсітэт, стаць самастойным». А цяпер... Цяпер яны з жалем гавораць аб тым, што прыйшоў час развітвацца, што ўжо ніколі ў іх не будзе такіх цікавых студэнцкіх сустрэч, вясёлых Дзён ФПМ, што не будуць яны больш праседжваць вечарамі над афармленнем наступнага нумара «Алгарытма», не паслухаюць ужо лекцыю любімага выкладчыка.

Яны — выпускнікі, або, як гаворыцца, «без пяці хвілін маладыя спецыялісты». Чаму без пяці? Гэтыя хвіліны — апошні крок да дыплома, прыступка да прафесіі. Страшна? І так, і не. Так — таму, што цяпер усё прыйдзецца рашаць самому, без падказкі і канспекта, не — таму, што разам з табой застаюцца тыя веды, якія набыў ва універсітэце.





А зараз — апошнія выпрабаванні, апошні студэнцкі экзамен. Вельмі спакойныя, без тых спецыфічна студэнцкіх стараннў перад здачай паспець прагледзець недачытанае, сядзяць у аўдыторыі выпускнікі 24-й групы факультэта прыкладной матэматыкі. Навуковы камунізм — дысцыпліна не з лёгкіх, але бачна, што рабяты упэўнены у сваіх ведах.

Э. В. Шастаковіч, член дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, робіць рад заўваг па ходу экзамена. І вось...

— Неабходна, каб праца ператварылася з жыццёвай неабходнасці ў патрэбу...

Першай адказвае Оля Хадасевіч. Пытанні, на яе погляд, нескладаныя, і дзяўчына упэўнена расказвае аб мірных формах сацыялістычнай рэвалюцыі, аб класавай барацьбе, працоўным выхаванні і фарміраванні асобы. Экзаменатары задаволены: першая «пяцёрка» ёсць! Ледзь прыкметна хвалюецца В. Шылкін, зараз яму адказваць. Білет ён ведае, а што ж яшчэ можа спытаць старшыня ДЭКа?

Дзяржаўныя экзамены па навуковаму камунізму на ФПМ падыходзяць к канцу. Ужо ёсць вынікі здачы ўсіх груп факультэта: «выдатна» атрымалі 18 чалавек, 24 чалавекі здалі на «добра» і 8 на «здавальняюча».

— Увогуле, экзамены праходзяць добра, — сказаў мне Э. В. Шастаковіч. — Адчуваецца, што прадмет выпускнікі ведаюць.

І. САВЕТКІНА,
Фота Т. Петрашкевіч.

## З В А Р О Т

### БАЙЦОЎ СБА «БУРАВЕСНІК» ІМЯ ГЕРОЯ САВЕЦКАГА САЮЗА В. І. КАЗЛОВА ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ДА ЎСІХ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

**Увесь савецкі працоўны народ, натхняемы гістарычнымі рашэннямі XXV з'езда КПСС, актыўна ўключыўся ў работу па ажыццяўленню грандыёзных планаў дзесятай пяцігодкі. Па ініцыятыве перадавых калектываў новую пяцігодку вырашана ператварыць у пяцігодку якасці, працоўнай гарантыі. Наш атрад па выніках мінулага пяцігоддзя быў названы адным з лепшых ва універсітэце. Сёння мы поўныя рашучасці працаваць з яшчэ большым энтузіязмам, без адстаючых, якасна, што стане не толькі вытворчай, але і маральнай нормай кожнага камсамольца атрада. Мы, байцы СБА «Буравеснік», звяртаемся да ўсіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта з заклікам унесці дастойны ўклад у выкананне новага пяцігадовага плана, працаваць пад дэвізам «Пяцігодку — у чатыры гады, пяцідзёнку — за 4 дні!»**

**Кіруючыся рашэннямі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, байцы СБА «Буравеснік» прымаюць на дзесятую пяцігодку наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:**

**1. Асвоіць на меліярацыйных і будаўнічых аб'ектах Беларусі не менш 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.**

**2. Кожны аб'ект здаваць у эксплуатацыю толькі з адзнакай «добра» і «выдатна».**

**3. Прыняць актыўны ўдзел у аперацыі «Доўг», ударнай справай атрада лічыць шэфства над помнікамі воінам і партызанам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**4. Прыняць актыўны ўдзел ва ўсесаюзным руху «Камсамол — сельскай школе», аказаць шэфскую дапамогу ва ўмацаванні вучэбна-матэрыяльнай базы, у паляпшэнні камуністычнага выхавання піянераў і камсамольцаў, прафесійнай арыентацыі школьнікаў:**

**а) аказаць дапамогу ў рамонце школьных памяшканняў;**

**б) абсталяваць 4 вучэбныя кабінеты;**

**в) перадаць 200 тамоў мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, аформіць 10 стэндаў і перасоўных выставак;**

**г) ахапіць работай у піянерскім лагеры 120 піянераў і малодшых школьнікаў.**

**5. Праводзіць актыўную работу з сельскім насельніцтвам па растлумачэнню рашэнняў XXV з'езда КПСС, палітыкі партыі, асноўных напрамкаў развіцця народнай гаспадаркі. Лектарскай групе прачытаць не менш 50 лекцый, прысвечаных планам дзесятай пяцігодкі, 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.**

**6. Да пачатку працоўнага семестра 1977 года выдаць літаратурны альманах «Буравеснік», прысвечаны 10-гадоваму юбілею атрада.**

**7. Пералічыць у фонд Міру 1.000 рублёў.**

**8. У рамках аперацыі «Восстановление» адкрыць мемарыяльную зямлянку-музей на месцы дыслакацыі Мінскага падпольнага абкома партыі.**

**Мы, байцы СБА «Буравеснік» выказваем цвёрдую упэўненасць у тым, што прыкладзём усе сілы і уменне для паспяховага выканання прынятых абавязацельстваў, унясём дастойны ўклад у справу выканання планаў пяцігодкі, справу будаўніцтва камунізму. Мы заклікаем усіх байцоў будатрадаў універсітэта падтрымаць нашу ініцыятыву, адказаць ударнымі справамі, высока пранесці сцяг усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада.**

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ,
камандзір атрада.

Зінаіда ДАРАШЧОНАК,
камісар.

Леанід БЯЛЕВІЧ,
камсорг.

## НЕЗАБЫЎНАЕ

**Нядаўна на філфаку адбыўся тэматычны вечар, прысвечаны подзвігу медыцынскіх работнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У прасторнай актавай зале сабраліся студэнткі, якія праходзяць медпадрыхтоўку, госці, ветэраны вайны, выкладчыкі ваеннай кафедры, медыкі. Сярод іх заслужаны ўрач БССР, падпалкоўнік медслужбы, член Беларускага савета ветэранаў вайны Я. Я. Сяркова, заслужаны ўрач БССР, палкоўнік медслужбы І. А. Кажанкоў, палкоўнік авіяцыі, выкладчык ваеннай кафедры М. М. Калінін, падпалкоўнікі медслужбы, выкладчыкі кафедры Г. П. Драбышэўскі, В. І. Цімафееў, М. С. Бабровіч, А. М. Кайкоў, А. Н. Нікіфараў, Д. П. Аліфер.**

**...Многа цяжкіх кіламетраў прайшла Я. Я. Сяркова, перш чым закончыла вайну ў Берліне. Яна расказала аб тым, як арганізоўваліся ваенныя шпіталі, як вялася барацьба са страшнай хваробай — тыфам, як сустракалі яны самы шчаслівы дзень —Дзень Перамогі.**

**Усхвалявана і шчыра гаварыла студэнтка III курса філфака Ніна Бугай: «Я ведаю вайну толькі па кнігах і фільмах. Але і мне сняцца сны пра вайну». Дзяўчына расказала аб тым, як адлюстраван бессмяротны подзвіг урачоў у творах мастацкай літаратуры.**

**Многім воінам і партызанам выратаваў жыццё выдатны хірург Я. У. Клумаў. Назаўсёды застанецца ён у памяці людской. Пасмяротна ўрачу - патрыёту прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Аб гэтым расказала прысутным студэнтка III курса Бабнова.**

**У заключэнне вечара цёплыя вершы аб ваенных санінструктарах прачыталі студэнты В. Калінава і А. Брайко.**

**М. ДУБРАВІН,
студэнт II курса
журфака.**

ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

## СБА ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА: ГАВОРАЦЬ ЛІЧБЫ

**Каля 7 000 цаглін уклалі байцы атрада ў сцены будучага будынка склада на тэрыторыі Мінскага радыёзавода ў час працоўнага дэсанта. Вось ужо больш трох год па плану работы атрада ў падрыхтоўчы перыяд выязджаюць байцы на гэта прадпрыемства, на свой нядзельнік, які ўжо стаў традыцыйным. На практыцы правяраецца гатоўнасць кожнага байца і атрада ў цэлым да правядзення трэцяга працоўнага семестра. У гэтым годзе на сродкі, заробленыя на нядзельніку, байцы атрада вырашылі абсталяваць Ленінскі пакой і стэнды для будаўнікоў БАМа.**

* * *

**Звыш 1000 кніг будзе сабрана для бібліятэкі самага маладога горада Паўднёвай Якуціі — Нерунгры — байцамі СБА імя Ленінскага камсамола. З заклікам сабраць тысячу кніг для будаўнікоў БАМа яны звярнуліся да школьнікаў горада Мінска. Піянерскія і камсамольскія арганізацыі школ горача адгукнуліся на заклік будатрадаўцаў. Ужо зараз бібліятэка атрада налічвае больш 500 кніг.**

* * *

**Пяць байцоў атрада — У. Карагін, М. Кобрык, М. Жауно, І. Мацюн, В. Мядзелец — сталі кавалерамі знака ЦК ВЛКСМ «Молодой гвардеец пятилетки». Гэтай узнагароды яны былі удастоены за актыўны ўдзел у летніх і зімовых працоўных семестрах.**

* * *

**20 лекцый і дакладаў было падрыхтавана і прачытана членамі лектарскай групы атрада ў падрыхтоўчы перыяд. Асноўная тэматыка лекцый — прапаганда матэрыялаў XXV з'езда КПСС, дасягненні БССР у дзевятай пяцігодцы, прапаганда ВНУ, прафарыентацыя. У лектарскую групу уваходзіць кожны трэці баец атрада.**

**У. КАЦАПАЎ.**

## ЛЕТА АБЯЦАЕ БЫЦЬ ГАРАЧЫМ

Прайшло больш 17 гадоў з таго часу, як у нашай краіне былі створаны першыя студэнцкія будаўнічыя атрады. З кожным годам яны растуць і мацнеюць, іх задачы становяцца складаней і цікавей. Калі ў 1959 годзе ў гэтым руху па ўсёй краіне ўдзельнічалі ўсяго 339 чалавек, то цяпер толькі на адным фізічным факультэце ў трэцім працоўным семестры 1976 года прыме ўдзел больш 500 байцоў.

У нас на факультэце сфарміравана 17 студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Дзевяць гадоў назад быў створан атрад «Аэліта», які ў гэтым годзе паедзе працаваць на ўдарную камсамольскую будоўлю — Байкала-Амурскую магістраль. А атрад «Спектр» вось ужо восьмы раз паедзе на будоўлі Казахстана.

Многа добрых спраў на рахунку нашых атрадаў. Толькі за лета 1975 года было прачытана каля 200 лекцый, пастаўлена 110 канцэртаў, створана 12 піянерскіх лагераў «Спадарожнік», арганізавана 17 кансультацыйных пунктаў, адрамантавана 13 вясковых школ. Ва ўсіх атрадах прайшоў Дзень ударнай працы ў фонд будаўніцтва новага горада, які носіць імя першага ў свеце касманаўта Ю. Гагарына.

Поспех працы студэнцкіх будаўнічых атрадаў залежыць перш за ўсё ад ступені падрыхтоўкі да яе. Ужо цяпер нашы лектары выступаюць з лекцыямі ў падшэфных школах, прафтэхвучылішчах, дзе хутка выступяць і агітбрыгады са сваімі канцэртнымі праграмамі. Нядаўна мы правялі агляд-конкурс на лепшую атрадную газету. Дзве лепшыя з іх, якія рэдагуюць камісары С. Пратас і М. Ляўковіч, прадстаўлены на універсітэцкі агляд-конкурс.

16 лістапада 1975 года мы правялі суботнік у гонар 34-й мінскай гарадской справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі, а 8 і 10 красавіка 1976 года атрад «Спадчына» правёў два «працоўныя дэсанты» на ўборцы новага будынка (БУ-8). Намячаюцца суботнікі і ў іншых атрадах.

Лета абяцае быць гарачым. Але мы упэўнены, што яно, як і мінулыя, прынясе многа новых перамог і адкрыццяў.

**М. НІЧЫПАРОВІЧ,
начальнік ШПС
фізічнага факультэта.**

# СА СТАРОНАК НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ

«ВИТА»

## ДЗЕЛАВЫЯ КАНТАКТЫ

Падрыхтоўчы перыяд, які папярэднічаў сустрэчы прадстаўнікоў шведскай фірмы «Фармацыя» са студэнтамі і супрацоўнікамі біялагічнага факультэта, працягваўся больш паўгода. І вось у канцы сакавіка сабраліся прадстаўнікі нашай ВНУ, спецыялісты з інстытутаў АН БССР — біяарганічнай хіміі, мікрабіялогіі, фотабіялогіі, генетыкі, фізіялогіі, з мединститута і г. д.

У гэты дзень прадстаўнікі розных арганізацый (а іх было каля 70) праслухалі лекцыі гасцей са Швецыі — дактароў Тунберга і Сандберга. Апошні расказаў аб практычным выкарыстанні прылад для электрафарэза, якія выпускае фірма «Фармацыя». Лекцыйны матэрыял быў замацаван на практычных занятках.

У выніку даследаванняў удалося не толькі азнаёміцца з навінкамі, якія дэманстравала фірма, не толькі, як гаворыцца, сваімі рукамі выканаць эксперымент і атрымаць канкрэтныя вынікі, але і скласці больш дакладнае ўяўленне аб магчымасцях новых метадаў. Такія сустрэчы садзейнічаюць развіццю навуковага супрацоўніцтва і ўмацаванню сяброўскіх сувязей.

**М. ШОЛУХ,**
**асістэнт кафедры біяхіміі.**

«СЛОВА ФІЛОЛАГА»

## КУРАТАР

Непрыкметна пралятаюць гады вучобы. Яны запамінаюцца нам цікавымі лекцыямі, дыспутамі; назаўсёды застаецца ў памяці практыка, работа на калгасных палетках восенню. У гады вучобы мы знаходзім сапраўдных сяброў, сустракаемся з выдатнымі людзьмі, і кожны з іх пакідае ў нас іскрынку нечага светлага.

Усе студэнты нашай групы заўсёды з цеплынёй будуць успамінаць куратара групы Ларысу Нікіфараўну Гусеву. Аб ёй вельмі цяжка пісаць, цяжка выказаць словамі ўсю нашу цеплыню і ўдзячнасць. Ларыса Нікіфараўна не проста выконвае свой доўг. Усё, што яна робіць, —гэта ад чыстага сэрца, з мацярынскай цеплынёй і ласкай. Навуковая работа, лекцыі, прыём экзаменаў, залікаў, кіраўніцтва напісаннем курсавых работ, сходы—ці мала такога роду заняткаў у Ларысы Нікіфараўны. Але яны не перашкода для работы куратара, які заўсёды знойдзе час, каб сустрэцца з групай, пагаварыць са студэнтамі, якія пачынаюць адставаць у вучобе.

Мінулай восенню, калі ўся група была на сельгасработах, Ларыса Нікіфараўна аднойчы прыехала да нас у вёску. Выбраўшы свабодны дзень, яна вырашыла паглядзець, як жывуць яе выхаванцы, калі трэба, дапамагчы. Чуласць, душэўныя адносіны да студэнта, а не фармалізм, характарызуюць яе работу. Як педагог яна можа своечасова знайсці ключ да кожнага сэрца, падтрымаць у цяжкую хвіліну, заўважыць, што ў чалавека нешта не ладзіцца, што ў групе нешта адбываецца, умяшацца, быццам і непрыкметна, але важка. І студэнты адчуваюць гэтую цеплыню і цэняць яе. Ларыса Нікіфараўна імкнецца да таго, каб у групе быў здаровы клімат, каб студэнты адносіліся адзін да аднаго чула, мякка. І гэта дае свае вынікі.

Група наша лічыцца моцнай з першага курса. А цяпер ужо дзве сесіі запар займае першае месца па паспяховасці па факультэту. Але зрабіць групу перадавой —не самамэта Ларысы Нікіфараўны. Усё гэта вынік умелага ўздзеяння на студэнтаў, ведання іх.

Непрыкметна праходзяць гады вучобы. Пакінуўшы сцены універсітэта, кожны з нас панясе ў сабе тую іскру цяпла і дабраты, якую пакінула ў нас Ларыса Нікіфараўна, панясе, каб перадаць яе іншым...

**А. МАЗУРЭНКА,**
**студэнт III курса IV групы філфака.**

«ИСТОРИК»

## МЫ—БУДУЧЫЯ ПЕДАГОГІ

Ужо год працуе пры адным з мінскіх домакіраўніцтваў наш педатрад, які створан на базе III курса гістарычнага факультэта. Члены педатрада дзяжураць у домакіраўніцтве з мэтай арганізацыі адпачынку дзяцей пасля заняткаў, вядуць гурткі, праводзяць віктарыны, ранішнікі, піянерскія зборы. Асабліва актыўна працуюць гурткі танцаў, вязання, драмгурток.

Нядаўна прайшлі гутаркі «Генерал Карбышаў», «Праца і прыгажосць», «Хакей — спорт мужных»

Усе педатрадаўцы працуюць з ахвотай, добрасумленна. Асабліва вызначаюцца студэнты Г. Халіпава, А. Кругалевіч, Н. Лянкевіч, С. Жлоба, Н. Белавусава, С. Таўгень.

**З. БЕРНЯКОВІЧ,**
**камандзір педатрада III курса гістфака.**

«РЕШИМ ЛЮБУЮ ЗАДАЧУ» *(ГУМАРЭСКА)*

## БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ

Была ціхая вясновая раніца. Пеця Ш. ішоў па праспекту і думаў: «Вось я студэнт трэцяга курса, на лекцыі часам хаджу, практычныя калі-нікалі наведваю. Так, навука — гэта сіла. Інтэгралы, дыферэнцыялы... А душа —яна пяшчоты патрабуе... Вось прачнуся я раптам жанаты, сталы. Жонка кавы ў пасцелю падасць. Прыйду на фак, памочнік дэкана спытае: «Ты чаму ўчора лекцыю прагуляў?»—А я яму: «А ў мяне дзіця ўсю ноч жыватом маялася». Зноў жа, вярнуся дадому, чаю з малінай пап'ю... У групе на вяселле скінуцца. Цікава, па колькі? Добра б па пяць. 23 на 5—115. Што на гэтыя грошы купіць можна? Шафу можна. А яшчэ дзесятку падкінуць — матаролер можна. Вось куплю матаролер, паедзем з жонкай на поўдзень... А яшчэ 30 рублёў прыбавіць — каляску можна купіць. Пакладзём дзіця ў каляску—і паедзем...»

— Малады чалавек! — перарваў мары моцны грубы голас. — Вы чаму на чырвонае святло ідзеце? Тры рублі падрыхтуйце.

Пецева рука бездапаможна павісла ў паветры з квітанцыяй...

«Дурань я, — падумаў ён. — Ну навошта мне жаніцца?.. Апошнія тры рублі былі... Дзіця крычаць будзе... Цешча... Да матаролера каляску не дастанеш... І ўвогуле... Навука —гэта сіла. Інтэгралы, дыферэнцыялы... Душа радуецца...»

Была ціхая вясновая раніца.

**(З насцегазеты механіка-матэматычнага факультэта).**

## ЗДЫМАЕ АНАТОЛЬ БАСАЎ



Ён першакурснік факультэта журналістыкі. Пакуль што. Апублікаваных здымкаў каля 900. Дзесяць з іх змешчаны ў «Комсомольской правде». Любімая камера — «Зеніт» з аб'ектывам «Пентакон». Здымае пры любых умовах. Надзвычай працаздольны і ўвогуле здольны. Сціплы. Быць з ім вельмі прыемна.

Беларусію ведае, ну, скажам, як састаў праявіцеля для паперы. Пачынаючым фотааматарам прапаноўваю адзычыць у яго апаратыўнасці. Яшчэ ўвосень Басаў рабіў здымкі для насценгазет «Слова дэлегата» камсамольскіх канферэнцый БДУ, Кастрычніцкага раёна, горада. Яго работы — амаль ва ўсіх нумарах факультэцкай «насценкі». Працавіты. Ну, а пра астатняе раскажуць здымкі. Вашай увазе прапануўваецца фотанарыс «Хлебапёкі».

**А. МАРОЗАЎ.**





З насценнай газетай геаграфічнага факультэта «Мерыдыян» пазнаёміцца прыйшлося выпадкова. Увагу прыцягнула стракатае афармленне аднаго з ліcткоў, што вісяць на трэцім паверсе геакорпуса. Цяжка было здагадацца, што гэта. Вершы, прысвечаныя 8 Сакавіка, малюнак... Наша ўважлівае чытанне лістка заінтрыгавала праходзіўшых міма студэнтаў (пэўна, чалавек, які чытае «Мерыдыян», —з'ява вельмі незвычайная).

# ЯКАСЦЬ ГАЗЕТЫ,

### АБО ЧАМУ МОЖНА «ПАВУЧЫЦЦА» Ў РЭДКАЛЕГІІ «МЕРЫДЫЯНА»

— Што, спадабалася газета? Павучыцца ў нас вырашылі?

«Чаму павучыцца?»—падумалі мы, адразу не адчуўшы іроніі.

Размова з сакратаром камітэта камсамола геафака Анатолем Мойкіным была нядоўгай.

— Шмат у нас ёсць прэтэнзій да рэдактара і членаў рэдкалегіі, — сказаў ён. — Газета павінна выходзіць два разы ў месяц, а ў нас...

Ну, а як жа з якасцю? Разбяром апошні нумар «Мерыдыяна». Яркі плакат побач са словамі «Са святам, дарагія сябры!» настройвае чытачоў на ўрачысты лад. Тэматыка такая: вынікі камсамольскага сходу, прадстаячая практыка, сесія, спорт. Што ж, гэта нядрэнна. Але... Зноў «але». Матэрыялы падпісаны безаблічнымі прозвішчамі: Сінельнікаў, Шэсцель і г. д. У многіх подпісаў няма ініцыялаў, невядома, адкуль гэтыя аўтары. Загалоўкі не кампануюцца з артыкуламі, няма даведкі, хто выпускаў нумар, хто фатаграфаваў, маляваў і г. д., палова матэрыялаў не вычытвалася пасля надрукавання на машынцы. Напісаны яны, ва ўсякім разе большасць з іх, невыразна, сухой мовай. То тут, то там сустракаюцца такія «перлы»: «...а нядаўна група вызваліла яго ад пасады праформга, таму што ў студэнтаў знікла ўсякая ўпэўненасць у Садзіне. Нават немагчыма сказаць аб тым, ці зможа ён далей вучыцца. А галоўным вынікам гэтага будзе летняя сесія».

З году ў год «Мерыдыян» не вызначаўся ні глыбінёй матэрыялаў, ні прыгажосцю афармлення. Разнабой у подпісах артыкулаў, адсутнасць «візітнай карткі» рэдкалегіі, нецікавая тэматыка—гэтыя і іншыя хібы сталі прывычнымі. Іх ужо не заўважаюць, з імі змірыліся. Газета стала мала каму патрэбна, нават заміцае студэнтам — членам рэдкалегіі, якія раз у два-тры месяцы марнуюць час, збіраюцца, выпускаюць, стараюцца, але...

Знайсці рэдактара «Мерыдыяна» не ўдалося. Яго намеснік Віктар Валогін коратка расказаў пра стан справы. У рэдкалегію ўваходзяць 12 чалавек з розных курсаў геафака. Кожны з іх у верасні, пасля выбрання, даваў абяцанне працаваць добрасумленна і шчыра. Але агульнай мовы члены рэдкалегіі ні ў верасні, ні ў канцы навучальнага года не знайшлі. Быў заменен рэдактар, «справа» «Мерыдыяна» разглядалася на пасяджэнні камітэта камсамола геафака. Андрэй Лабадо, новы адказны ў камітэце за друк, здаецца, зусім сур'ёзна ўзяўся за справу. Але вынікаў гэтых намаганняў камітэта ніхто так і не ўбачыў. Затое бачылі іншае. Рэдкалегія аказалася на дзіва спрытнай «фокусніцай». Святочны нумар да 23 лютага быў пераўтваран у святочны нумар да 8 Сакавіка літаральна ў дзве хвіліны. Узялі ды і заклеілі малюнак савецкага воіна малюнкам савецкай жанчыны. Лоўкасць рук, як кажуць, і ніякіх змен у астатнім тэксце газеты. Вучыцеся, журналісты!

Ну, а калі сур'ёзна, то даўно час спытаць у кіраўніцтва факультэта, грамадскіх арганізацый геафака за якасць газеты. Не верыцца, што няма тут талентаў, што няма сілы, якая б магла перадолець пасіўнасць і інертнасць у выпуску газеты.

**А. ЯНЧЭЎСКАЯ,**
**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

## ЗАПРАШАЕМ

**на першае пасяджэнне клуба фотааматараў, які створан пры рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт». Пасяджэнне клуба на грамадскіх пачатках будзе весці старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання Георгій Захаравіч Бягун. Фотааматары атрымаюць тут кваліфікаваную кансультацыю, парады па фотасправе. Рэдакцыя будзе рэгулярна змяшчаць лепшыя здымкі членаў клуба на старонках газеты. Жадаючым займацца ў клубе прадстаўляецца магчымасць карыстацца фотаабсталяваннем рэдакцыйнай лабараторыі.**

**Першае пасяджэнне адбудзецца ў чацвер, 27 мая, у 18 гадзін у памяшканні рэдакцыі (пакой № 14 геаграфічнага корпуса).**

## УВАГА!

**Падрыхтоўчае аддзяленне аб'яўляе конкурс на лепшы эскіз значка рабфакаўца. Эскізы прымаюцца ў камітэце камсамола аддзялення.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 04269 Заказ № 721.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.